# СТАМБУЛЬСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ

## Канвенцыя Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з’явамі






**ПРАДУХІЛЕННЕ**

**АБАРОНА**

**СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД**

**КААРДЫНАВАНАЯ ПАЛІТЫКА**

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L’EUROPE



# Стамбульская канвенцыя

## Канвенцыя Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з'явамі

Стамбульская канвенцыя засноўваецца на чатырох прынцыпах:

- ПРАДУХІЛЕННЕ
- АБАРОНА
- СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД
- КААРДЫНАВАНАЯ ПАЛІТЫКА

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

# ПРАДУХІЛЕННЕ

Краіна, якая ратыфікавала Стамбульскую канвенцыю, мусіць рэалізаваць наступныя меры:

Заахвочваць **сродкі масавай інфармацыі і прыватны сектар** усталёўваць стандарты, якія спрыяюць фармаванню гендарных роляў, заснаваных на узаемнай павазе, і аспрэчваюць падыходы, якія апраўдваюць гвалт у адносінах да жанчын

**Інфармацыйна-асветніцкія кампаніі**
**Павышэнне інфармаванасці**
аб розных формах гвалту, іх разбуральным характары і ўплыве на жанчын і дзяцей

**Адукацыя ў галіне негвалтоўных падыходаў і роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі**
Увесці навучальныя матэрыялы па гендарнай роўнасці, гвалце па гендарнай прыкмеце, негвалтоўным вырашэнні канфліктаў і праве на асабістую недатыкальнасць у афіцыйныя навучальныя праграмы на ўсіх узроўнях адукацыі

**Барацьба з гендарнымі стэрэатыпамі.**
Садзейнічаць зменам у сацыяльных і культурных мадэлях паводзін жанчын і мужчын

**Садзеянне пашырэнню правоў і магчымасцей жанчын**
Уводзіць праграмы і мерапрыемствы па пашырэнні правоў і магчымасцей жанчын і задавальняць канкрэтныя патрэбы людзей, якія знаходзяцца ва ўразлівым з пункту погляду правоў чалавека становішчы

**Праграмы для злачынцаў**
Ствараць праграмы для навучання негвалтоўным паводзінам асобаў, якія здзейснілі хатні гвалт, і для навучання асоб, якія здзейснілі злачынствы сексуальнага характару, з мэтай пазьбегнуць паўторных злачынстваў

**Роля мужчын і хлопчыкаў**
Заахвочваць актыўны ўдзел і ўнёсак мужчын і хлопчыкаў у прадухіленне гвалту

**Падрыхтоўка спецыялістаў**
Рыхтаваць спецыялістаў для працы з ахвярамі або злачынцамі, якія маглі б распазнаваць гвалт і рэагаваць на яго, а таксама накіроўваць пацярпелых у адпаведныя інстанцыі



# АБАРОНА

У цэнтры ўсіх мер абароны, прынятых краінай, павінна знаходзіцца бяспека і патрэбы пацярпелых і сведак. Гэтыя правы ўключаюць:

**Інфармацыя аб правах ахвяр**
Ахвяры павінны быць інфармаваныя аб сваіх правах і ведаць, дзе і як атрымаць дапамогу на той мове, якую яны разумеюць

**Службы падтрымкі**
Ахвяры павінны мець доступ да спецыялізаваных службаў падтрымкі жанчын, якія часта маюць жаночы персанал і скіраваныя на канкрэтныя віды гвалту. Ахвяры таксама павінны мець доступ да агульных паслуг, такіх як юрыдычныя кансультацыі/дапамога, псіхалагічныя кансультацыі, фінансавая дапамога, жыллё, адукацыя, медычнае абслугоўванне, сацыяльныя паслугі і дапамога ў пошуку працы

**Рэгіянальныя і міжнародныя механізмы падачы скаргаў**
Ахвяры павінны быць паінфармаваныя пра адпаведныя рэгіянальныя і міжнародныя механізмы падачы скаргаў і мець доступ да іх

**Прытулкі**
Ахвяры павінны мець доступ да мясцовага, лёгкадаступнага прытулку для жанчын і дзяцей

**Крызісныя цэнтры дапамогі ахвярам згвалтаванняў або сексуальнага гвалту**
Ахвяры павінны мець доступ да бліжэйшых лёгкадаступных цэнтраў, якія забяспечваюць неадкладную медычную кансультацыю, дапамогу пры траўмах і судова-медычную экспертызу

## Паведамленне органам улады аб гвалце
Кожная асоба мусіць быць заахвочаная паведамляць аб актах гвалту у адпаведныя органы для прадухілення далейшых інцыдэнтаў, і правілы канфідэнцыйнасці не павінны перашкаджаць рабіць гэта спецыялістам, калі гэта апраўдана

## Экстраныя забаронныя судовыя загады
Такія пастановы даюць паліцыі права выдаліць асобу, якая ўчыніла хатні гвалт, з дому на пэўны перыяд часу і забараніць ёй кантактаваць з ахвярай

## Ахоўныя і стрымальныя судовыя загады
Яны павінны быць лёгка даступнымі для неадкладнай абароны ахвяры і прадстаўляцца бясплатна

## Бяспечнае права апекі і наведвання для дзяцей
Калі ў мінулым прысутнічаў факт гвалту, рашэнні аб апецы і праве наведвання павінны аддаваць прыярытэт правам і бяспецы дзіцяці і ахвяры

## Бясплатныя тэлефонныя службы даверу, якія працуюць 24/7
Ахвяры павінны мець доступ да бясплатнай,  канфідэнцыйнай, кругласуткавай і штодзённай тэлефоннай службы даверу, якая зможа прапанаваць ім экспертныя парады і накіраваць да адпаведных службаў

## Правы і патрэбы дзяцей-сведак
Неабходна ўлічваць найлепшыя інтарэсы дзяцей, якія сталі сведкамі гвалту, і прадастаўляць ім псіхасацыяльную дапамогу, якая адпавядала б іх узросту



# СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД

Калі краіна ратыфікавала Стамбульскую канвенцыю, яна павінна забяспечыць:

## Праваахоўныя і судовыя працэсы

### Дзейсныя санкцыі для злачынцаў

Запяспечыць, каб крымінальныя злачынствы і парушэнні ахоўных судовых загадаў караліся прапарцыйнымі крымінальнымі або прававымі санкцыямі, уключна з пазбаўленнем волі, экстрадыцыяй, маніторынгам і наглядам, а таксама пазбаўленнем бацькоўскіх правоў

### Эфектыўны судовы пераслед

Расследаванне або судовы пераслед гвалтоўных злачынстваў супраць жанчын будзе ўлічваць, што жанчыны ў нашмат большай ступені церпяць ад гвалту; яно не будзе залежаць ад паведамлення або скаргі ахвяры і можа працягвацца нават калі ахвяра адкліча сваю заяву або скаргу

### Разгляд абцяжарвальных абставінаў

Забяспечыць, каб суд браў пад увагу абцяжарвальныя абставіны, такія як: ахвяра з’яўляецца блізкім партнёрам або сваяком злачынцы; злачынства здзейсненае ў дачыненні да ўразлівай асобы або ў прысутнасці дзіцяці; злачынства здзейсненае ў змове з іншымі людзьмі; надзвычайны ўзровень гвалту або нанесенай псіхалагічнай шкоды; пагроза выкарыстання зброі; наяўнасць судзімасці за падобныя злачынствы

### Заканадаўства, якое прадугледжвае крымінальную адказнасць за гвалт у адносінах да жанчын

Увесці законы, якія крыміналізуюць фізічны, псіхалагічны і сексуальны гвалт, сексуальныя дамаганні, праследаванне, калечанне жаночых палавых органаў, прымусовыя шлюбы, прымусовыя аборты і прымусовую стэрылізацыю. Дзяржавы-ўдзельніцы будуць сачыць за тым, каб культура, традыцыі або так званы «гонар» не выкарыстоўваліся для апраўдання гвалту

### Эфектыўнае паліцэйскае расследаванне

Праваахоўныя органы мусяць неадкладна рэагаваць на звароты па дапамогу, належным чынам кіраваць небяспечнымі сітуацыямі і расследаваць усе заявы аб гвалце ў адносінах да жанчын

# Правы ахвяр

## Абарона дзяцей, якія сталі ахвярамі або сведкамі гвалту

- Дзецям будуць прадстаўленыя адпаведныя спецыяльныя меры аховы
- Дзецям, якія сталі ахвярамі сексуальнага гвалту, прымусовага шлюбу, калецтва жаночых палавых органаў і прымусовага аборту або стэрылізацыі, будзе прадстаўлены дастатковы перыяд часу пасля дасягнення паўналецця для таго, каб ініцыяваць судовы працэс

## Каардынаваная ацэнка рызыкі

будзе праводзіцца ў супрацы з адпаведнымі агенцтвамі і ўстановамі з улікам паўторных злачынстваў і доступу да агнястрэльнай зброі, а таксама любой новай інфармацыі, якую можа выявіць расследаванне

## Непрымальнасць перакладвання віны на ахвяру

Расследаванні і судовыя працэсы будуць дэманстраваць павагу да ахвяр на ўсіх этапах і ўстрымлівацца ад падыходаў, паводзін і практык, якія ўскладаюць віну на ахвяр і выклікаюць у іх дадатковыя пакуты

## Права пацярпелых на прыватнае жыццё

- Забяспечыць, каб інфармацыя пра асобу і выгляд ахвяры была абароненая, і каб можна было пазбегнуць кантактаў паміж ахвярай і меркаваным злачынцам там, дзе гэта магчыма
- Ахвярам будзе дадзеная магчымасць прадстаўляць доказы і паведамляць пра свае патрэбы і праблемы непасрэдна або праз пасярэдніка
- Ахвярам будзе дадзеная магчымасць сведчыць у зале суда з дапамогай камунікацыйных тэхналогій або, прынамсі, у адсутнасць меркаванага злачынцы
- удзе дазволена звяртацца да гісторыі сексуальных адносін ахвяры ў грамадзянскіх або крымінальных судовых працэсах толькі у тых выпадках, калі гэта актуальна і неабходна

## Права ахвяр на інфармацыю і падтрымку

- Ахвяры маюць права быць інфармаванымі аб ходзе і і выніках іх справы
- Мець доступ да інфармацыі аб правах ахвяры і да адпаведных службаў падтрымкі, каб дапамагчы ім прадстаўляць гэтыя правы і інтарэсы
- Падтрымка і дапамога з боку дзяржаўных і няўрадавых арганізацый і спецыялістаў-кансультантаў па пытаннях хатняга гвалту падчас расследавання і судовага працэсу
- Права на юрыдычную падтрымку і бясплатную юрыдычную дапамогу
- Пры неабходнасці прадастаўленне незалежных і кампетэнтных перакладчыкаў
- Закон мусіць падтрымліывць права ахвяр патрабаваць кампенсацыі ад вінаватых у гвалце і падаваць у суд на дзяржаўныя органы, калі яны не выканалі свае абавязкі па прадухіленні і абароне

## Абарона пацярпелых падчас расследавання і судовага працэсу

- Ахвяры гвалту і іх сем'і будуць абароненыя ад запалохвання, помсты і паўторнай віктымізацыі на ўсіх этапах расследавання і судовага працэсу
- Альтэрнатыўныя варыянты вырашэння спрэчак, такія як пасярэдніцтва паміж ахвярай і злачынцам, не будуць абавязковымі
- Ахвяра будзе паінфармаваная аб любых выпадках уцёкаў або вызвалення злачынцы



# КААРДЫНАВАНАЯ ПАЛІТЫКА

Калі краіна ратыфікавала Стамбульскую канвенцыю, яна павінна будзе распачаць наступныя дзеянні:

### Міжведамаснае ўзаемадзеянне

Стварыць адпаведныя механізмы, якія забяспечвалі б эфектыўнае супрацоўніцтва паміж судовай сістэмай, пракуратурай, праваахоўнымі органамі, мясцовымі і рэгіянальнымі органамі ўлады і няўрадавымі арганізацыямі (НУА)

### Падтрымка і праца з грамадзянскай супольнасцю і НУА

Яны павінны быць уключаныя разам з дзяржаўнымі органамі ў якасці важных партнёраў у рэалізацыі Стамбульскай канвенцыі

### Каардынаваць дзеянні і кантраляваць выкананне

Стварыць або прызначыць дзяржаўны орган для нагляду за каардынацыяй, выкананнем, маніторынгам і ацэнкай выканання Стамбульскай канвенцыі

### Палітыка, заснаваная на правах чалавека
Прыняць законы, арыентаваныя на ахвяр, для прадухілення і барацьбы з усімі формамі гвалту ў адносінах да жанчын

### Рэакцыя ўсяго грамадства
Стамбульская канвенцыя пасылае выразны сігнал усяму грамадству. Усе павінны разумець, што гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт не будуць дапускаццas

### Фінансаванне палітыкі і паслуг
Адэкватна фінансаваць усіх партнёраў, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі Стамбульскай канвенцыі, у тым ліку няўрадавыя арганізацыі

### Усеабдымнае заканадаўства і гендарна-адчувальная палітыка
Увесці законы і дапаможныя меры для прадухілення ўсіх відаў гвалту, ахопленых гэтай Канвенцыяй

### Даследаванні і збор дадзеных
Збіраць і супастаўляць дадзеныя і праводзіць даследаванні таго, наколькі распаўсюджаныя ўсе формы гвалту ў адносінах да жанчын і наколькі эфектыўныя прынятыя меры. Вынікі гэтых даследаванняў павінны быць перададзеныя грамадскасці і аналагічным службам у іншых краінах для параўнання і заахвочвання супрацоўніцтва



www.coe.int/conventionviolence

PREMS 132023

BEL

www.coe.int

Савет Еўропы з'яўляецца вядучай арганізацыяй кантынента па абароне праў чалавека. У склад гэтай арганізацыі ўваходзяць 46 дзяржаў-членаў, у тым усе члены Еўрапейскага саюза. Усе дзяржавы-члены Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую Канвенцыю па абароне Праў чалавека і асноўных свабод -дамову, распрацаваную для абароны праў чалавека, дэмакратыі і вяршынства закона. Еўрапейскі суд па правах чалавека назірае за рэалізацыяй Канвенцыі ў дзяржавах-членах.

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE